Веcткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

Viestki j Paviedamlenni

Сусьветнае сеціва: *e-krama.com, www.pahonia.org*
Электронны адрас: *viestki@mail.com*
✉ *VIESTKI, P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735*

№ 1 (575)
Студзень 2014 г.

Адзначэньне Дня Герояў – 93-х угодкаў Слуцкага Збройнага Чыну – ў Гайлэнд-Парку

У нядзелю 1-га сьнежня ў Гайлэнд-Парку, Нью-Джэрзі, адбылося сьвяткаваньне Дня Герояў – 93-х угодкаў Слуцкага Збройнага Чыну, ладжанае супольна Беларуска-Амэрыканскім Згуртаваньнем "Пагоня" і аддзелам Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў Нью-Джэрзі. Імпрэза адбылася ў грамадзкай залі пры царкве сьв. Маці Божае Жыровіцкае. З раніцы ў царкве прайшло набажэнства і паніхіда па змагарах, якія загінулі за волю і незалежнасьць Беларусі. Затым прысутныя падсілкаваліся смачным абедам, падрыхтаваным сястрыцтвам царквы з удзелам сп-няў Г. Войтанка і Л. Бакуновіч.

Затым адбылася ўрачыстая акадэмія, напачатку якой выступіў старшыня аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў Нью-Джэрзі сп. Юрка Азарка. Ён прывітаў прысутных, павіншаваў іх зь Днём Герояў, даў кароткі агляд падрыхтоўкі да Збройнага Чыну і назваў ягоныя асноўныя падзеі, а таксама распавёў пра важнасьць гэтай гістарычнай даты, якую рэгулярна ўжо каторы год адзначаюць прадстаўнікі беларускай грамады ў Амэрыцы.

Ад імя Згуртаваньня "Пагоня" прысутных прывітаў яго старшыня сп. Віталь Зайка. Ён адзначыў, што Слуцкі Збройны Чын павінен быць прыкладам ахвярнасьці і адданасьці агульнай справе для ўсіх беларусаў, асабліва, для моладзі.

З грунтоўным разглядам гістарычных падзяў, што прывялі да гераічнага змаганьня случчакоў, і з аналізам міжнарожных падзеяў таго часу выступіў сп. Сьветавіт Сокалаў. Праводзячы паралелі з сёнешнім днём, ён адзначыў, што галоўным ворагам, поруч з навалай з усходу, зьяўляецца апатыя і абыякавасьць да лёсу Бацькаўшчыны, і менавіта з гэтым трэба змагацца ў першую чаргу.

Затым адбыўся прагляд фільму пра Слуцкі Збройны Чын, які камэнтаваў сп. Дзяніс Талпека. Ён распавёў пра сваё ўласнае ўспрыняцьце гераічнага чыну случчакоў і адзначыў, што ў постсавецкай Беларусі, як і ў камуністычныя часы, гэтая падзея ўсяляк перакрыўлялася, называлася "вылазкай кулацкіх бандаў", "змаганьнем за папоў і абшарнікаў", а то і наўпрост замоўчвалася. Сп. Талпека распавёў пра гістарычны кантэкст Слуцкага Збройнага Чыну, пра сам Слуцак, горад Магдэбурскага права, і пра перадумовы стварэньня Рады Случчыны і фармаваньне ёю вайсковых адзінак для абароны краю перад наступаючымі бальшавіцкімі сіламі. Прамоўца даў агляд ходу збройнага змаганьня, калі вёскі некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі. Насельніцтва падтрымлівала сваіх абаронцаў, дапамагала харчамі, вопраткай, коньмі. Сілы былі няроўныя, і лёс змаганьня быў адразу вырашаны. Але яны не пажадалі для сябе іншага лёсу і выйшлі са зброяй у руках "паміраць, каб жыла Бацькаўшчына". Такі прыклад высокай ахвярнасьці і гераізму ёсьць арыентырам у жыцьці й дзенасьці ўсіх тых беларусаў, каму баліць душа за родны край. "Менавіта такія людзі складаюць фундамэнт незалежнасьці".

Затым з паведамленьнем пра жыцьцё і дзейнасьць пісьменьніка Ўладзімера Караткевіча, які цікавіўся Слуцкім

Заканчэньне на бачыне 2



Вянок ля помніка беларускім змагарам на могілках у Іст-Брансўіку, Нью-Джэрзі.

Сьнежаньскі сход Згуртаваньня “Пагоня”

У суботу 14-га сьнежня ў Доме Маракоў на Мангэтане прайшоў чарговы сьнежаньскі сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”. Напачатку сходу старшыня Згуртаваньня сп. Віталь Зайка прывітаў усіх, хто змог прыехаць на імпрэзу, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы надвор’я – сьнег і холад. Далей у сваім выступе сп. Зайка адзначыў, што ў сьнежні спаўняецца два гады, як было створанае Беларуска-Амэрыканскае Згуртаваньне “Пагоня”, беларуская грамадзкая арганізацыя ў Амэрыцы. Прамоўца спыніўся на тым, што было зроблена за гэтыя два гады.

“За прайшоўшы час адбываліся рэгулярныя сходы арганізацыі, у іх межах праводзіліся інфармацыйныя і тэматычныя мерапрыемствы, забясьпечвалася пляцоўка для навязваньня міжасабовых кантактаў і калегаваньня землякоў зь Беларусі. У рамках тэматычных імпрэзаў, прысьвечаных інфармацыі пра атрыманьне адукацыі ў ЗША і пошуку працы, якія былі арганізаваныя сябрам управы Згуртаваньня “Пагоня” сп. Яўгенам Барысевічам, многія ўдзельнікі здабылі карысную інфармацыю, некаторыя непасрэдна выкарысталі яе, напрыклад, для набыцьця спэцыяльнасьці і атрыманьня добрай працы.

Акрамя гэтага “Пагоня” праводзіла супольныя з аддзелам Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў Нью-Джэрзі сьвяткаваньні Дня Волі (угодкаў Акту 25 Сакавіка) і Дня Герояў (угодкаў Слуцкага Збройнага Чыну). З удзелам сяброў “Пагоні” ды пад кіраўніцтвам яе сакратара сп-ні Валянціны Якімовіч праводзіліся традыцыйныя беларускія абрады – Калядаваньне, Гуканьне Вясны і Купальле, распаўсюджвалася інфармацыя пра беларускія нацыянальныя традыцыі. Ладзіліся таксама мітынгі ў падтрымку змаганьня за свабоду і дэмакратыю ў Беларусі, супраць дыктатарскага рэжыму і перасьледу апазыцыі. Рэгулярна штогод адбываліся Чарнобыльскія мітынгі, апошні зь якіх стаў мітынгам пратэсту супраць пабудовы атамнай элетрастанцыі на Астравеччыне насуперак грамадзкай апініі й пратэстам жыхароў Астравецкай акругі.

Таксама “Пагоня” брала ўдзел у штогадовым Маршы Паняволеных Народаў і ў супольных зь “Беларусамі ў экзылі” і БАЗА пратэстных акцыях у Нью-Ёрку і Вашынгтоне.

Рэгулярна выходзіў і рассылаўся інфармацыйны бюлетэнь арганізацыі “Весткі й Паведамленьні”, друкаваліся календары “Пагоні”. На сходах Згуртаваньня праводзіліся прэзэнтацыі адзінага выдаванага ў замежжы выданьня творчых сілаў эміграцыі – альманаху “Беларус”. Функцыянуе сайт арганізацыі ў сецiве, што апавяшчае пра маючыя адбыцца імпрэзы, а таксама старонка “Пагоні” на Фэйсбуку. Аказваецца пасільная юрыдычная дапамога для тых землякоў, якія хацелі б зьмяніць статус у ЗША і атрымаць азыль. А галоўнае – “Пагоня” падтрымлівала беларускую прысутнасьць ў Амэрыцы і ў Нью-Ёрку, была месцам, дзе можна было пачуць беларускую мову, абмяняцца думкамі пра надзённыя і набалелыя пытаньні з жыцьця на Бацькаўшчыне і проста пабавіць час сярод землякоў”.


Яўген Барысевіч

Потым слова ўзяў сябар управы “Пагоні” сп. Яўген Барысевіч. Ён коратка распавёў пра сваю арганізацыйную працу ў галіне інфармаваньня землякоў пра мажлівасьці адукацыі й пошуку працы ў Амэрыцы. Затым ён паведаміў прысутным пра маючую адбыцца з удзелам Згуртаваньня “Пагоня” акцыю салідарнасьці зь беларускай апазыцыяй, якая пройдзе 21 сьнежня на Мангэтане а 1:00 папаўдні, насупраць штаб-кватэры Аб’еднаных Нацыяў на 1-й авэню пры 43-й вуліцы.

Наступна адбылося знаёмства з гасьцямі Згуртаваньня “Пагоня”, а затым пры сьціплых пачастунках і шклянцы віна прысутныя маглі навязаць знаёмствы і адзначыць два гады дзейнасьці маладой беларускай арганізацыі.

Віталь ЗАЙКА

93-я ўгодкі Слуцкага Збройнага Чыну

Заканчэньне з бачыны 1

Збройным Чынам і, наагул, паўстаньнямі супраць бальшавізму ў Беларусі, але ў тыя савецкія часы ня мог свабодна пісаць пра іх, выступіла сп-ня Вольга Навакoвіч. Да 83-х угодкаў народзінаў гэтага пісьменьніка-патрыёта і папулярызатара беларускай гісторыі яна коратка апісала ягоны жыцьцёвы шлях.

Са сваёю прапановаю адносна агульнай канцэпцыі беларускай гісторыі выступіў сп. Зьміцер Левіт. Ён прапанаваў стварыць групу, якая прысьвяціла б час выпрацоўцы канцэпцыі сапраўды аб’ектыўнага апісаньня і аналізу гістарычных падзеяў у Беларусі.

Вядомы паэт і бард Сяржук Сокалаў-Воюш выступіў са сваім вершам пра Паўлюка Багрыма, прыводзячы яго як прыклад той сілы духу і любові да Бацькаўшчыны, якім пазьней будуць кіравацца ў сваім змаганьні ўдзельнікі Слуцкага Збройнага Чыну.


Пасьля акадэміі быў усклалі вянок да помніка змагарам за вольную Беларусь на беларускіх могілках у Іст-Брансўіку, дзе пахаваны адзін з удзельнікаў Слуцкага Збройнага Чыну, афіцэр, а пазьней сьвятар, а. Хведар Данілюк.

Віталь ЗАЙКА

Кніга пра Раду БНР

Гардзіенка, Наталля, Юрэвіч, Лявон. Рада БНР (1947—1970): Падзеі. Дакументы. Асобы. Мінск: Кнігазбор, 2013. — 648 с. — (Бібліятэка Бацькаўшчыны: кн. 22).

Спэцыяльныя кнігі, прысьвечаныя Радзе БНР, зьяўляюцца нячаста. За апошнія дваццаць гадоў можна згадаць хіба "Архівы БНР" Сяргея Шупы ды працу Дароты Міхалюк, прысьвечаную даваеннаму пэрыяду дзейнасьці Рады. Нядаўна ж ў Менску пабачыла сьвет выданьне, асноўны акцэнт у якім ўпершыню зроблены на пасьляваеннай гісторыі Рады БНР.



Выхад кнігі Натальлі Гардзіенкі й Лявона Юрэвіча "Рада БНР (1947—1970): Падзеі. Дакументы. Асобы" зьвязаны зь сёлетнім 110-годзьдзем зь дня нараджэньня першага паваеннага Прэзыдэнта БНР Міколы Абрамчыка. Менавіта ягонай дзейнасьці на чале беларускага палітычнага прадстаўніцтва на Захадзе й прысьвечанае выданьне.

"Рада БНР (1947—1970)" складаецца зь сямі разьдзелаў. У першым зьмешчаны нарыс дзейнасьці Рады часоў Міколы Абрамчыка: аднаўленьня, разбудовы структуры ў Нямеччыне, пераезду ў ЗША, асноўных кірунках працы як унутры беларускіх грамадаў, гэтак і навонкі. Важныя сюжэты тут зьвязаныя з актыўнасьцю Рады й яе Прэзыдэнта ў міжнародным антыкамуністычным руху, заснаваньні беларускай рэдакцыі Радыё "Вызваленьне / Свабода" ды беларускага аддзелу ў Інстытуце вывучэньня СССР у Мюнхэне.

Другі – найвялікшы ў кнізе – разьдзел зьмяшчае пратаколы пасяджэньняў Рады і Ўраду БНР з адпаведнага пэрыяду. Аўтары кнігі на падставе збораў Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва, Беларускай бібліятэкі імя Ф. Скарыны ў Лёндане ды фонду Раісы Жук-Грышкевіч у Нацыянальным архіве Канады падрыхтавалі багатую падборку пратаколаў, якія пераважна ніколі не публікаваліся раней. Гэтыя матэрыялы даюць выдатную магчымасьць зразумець, чым жылі Рада й радныя ў 1940-х – 1960-х гг.: якія мэты ставіліся, якія ўмовы былі для працы, якія захады рабіліся, якія былі абставіны як унутры, гэтак і вонкі палітычнага прадстаўніцтва. Усе пратаколы, дзе згадваецца вялікая колькасьць імёнаў дзеячаў ня толькі беларускай эміграцыі, але й прадстаўнікоў палітычных колаў на выгнаньні летувісаў, латышоў, эстонцаў, расейцаў, украінцаў, казакаў, грузінаў і г. д., а таксама шмат амэрыканскіх палітыкаў, добра пракамэнтаваныя, што палегчыць чытачу ўспрыманьне тэкстаў гэтых дакумэнтаў. Працягам пратаколаў сталі зьмешчаныя ў трэцім разьдзеле кнігі – "Дакументы" – іншыя матэрыялы да дзейнасьці Рады БНР. Тут можна знайсьці Дэкларацыю, Статут, інструкцыі радным, адозвы й інш., што ілюструе згаданыя ў нарысе ды пратаколах падзеі з жыцьця БНР на эміграцыі.

У чацьвертым разьдзеле кнігі пададзеная падборка ліставаньня Прэзыдэнта й радных. Найбольш тут зьмешчана лістоў самога Міколы Абрамчыка ды Аўгена Каханоўскага, які пэўны час выконваў функцыі старшыні Ўраду БНР. Зьместоўныя эпісталярыі адлюстроўваюць асноўныя падзеі нутранага й вонкавага жыцьця БНР на выгнаньні, надзеі й канфлікты, што адбываліся ў беларускім асяродзьдзі.

Асобным разьдзелам пададзеная бібліяграфія як выданьняў самой Рады БНР, гэтак і прысьвечаных ёй артыкулаў на старонках найважнейшых беларускіх газэтаў на эміграцыі "Бацькаўшчына" й "Беларус". Біяграфічныя нарысы, сабраныя ў шостай частцы, сьведчаць пра адметнасьці лёсаў некаторых з галоўных герояў кнігі. А завяршае зьместавую частку "Хроніка дзейнасьці Рады БНР". У якасьці ілюстрацыяў у кнізе выкарыстаныя шматлікія фатаздымкі, копіі дакумэнтаў, лістоў, БНРаўскіх публікатак адпаведнага пэрыяду. Ёсьць тут і фатакопія знакамітага тэстамэнту Васіля Захаркі, зь якога, фактычна, і пачалася паваенная гісторыя Рады.

Усе зьмешчаныя ў кнізе матэрыялы маюць на мэце з розных бакоў паказаць дзейнасьць паваеннай Рады БНР і яе Прэзідэнта. Важна адзначыць, што кніга зроблена не ўнутры самой сучаснай Рады БНР, а як бы звонку, палітычна незаангажаванымі аўтарамі, што дазволіла падаваць матэрыялы пазьбягаючы зьнешняй ці нутранай цэнзуры.

Кніга "Рады БНР (1947—1970): Падзеі. Дакументы. Асобы" выглядае своеасаблівым першым каменем у падмурак сур'ёзнага вывучэньня дзейнасьці паваеннай Рады БНР, у стварэньне агульнай сыстэматызаванай гісторыі беларускай незалежнай дзяржаўнасьці.

Я. С.

Шаноўнае спадарства!

Разам са студзеньскім нумарам "Вестак і Паведамленьняў" кожны падпісчык нашага бюлетэня атрымае насьценны каляндар на 2014 год. Кожны месяц ілюструе фатаздымак адной з падзеяў, што адбыліся ў жыцьці Згуртаваньня "Пагоня" ў гэты ж месяц у годзе мінулым. Такім чынам новы каляндар – гэта сваеасаблівы летапіс жыцьця арганізацыі за мінулы год. Шмат хто зь сяброў "Пагоні" зможа знайсьці сябе на здымках календара.

Калі на момант рассылкі гэтага нумары Вы не былі падпісчыкам бюлетэня, альбо калі вы хочаце мець дадатковыя асобнікі календара, то напішыце, калі ласка, у рэдакцыю па емэйл адрасу ***viestki@mail.com*** У адказе Вам паведамяць, як можна набыць каляндар. З рэдакцыяй таксама можна зьвязацца па пошце, даслаўшы ліст на адрас, што пададзены на апошняй бачыне.



"Галгатня пра ЗыШыА"

З мора вады ня выбераш, зь песьні слова ня выкінеш

Ці то пад усёабдымным уплывам Галівуду, ці то з прычыны якой-небудзь іншай пошасьці, замест традыцыйнага народнага пасланьня ў Беларусі ўсё часьцей у гэтым кантэксьце можна пачуць „f*ck you". Дажыліся да таго, што гэтую лаянку засвойваюць дзеці, якія не навучыліся яшчэ толкам лічыць да дзесяці. На першы погляд, запазычанае пажаданьне здаецца зусім бясшкодным, асабліва ў параўнаньні з „грубым" нацыянальным эквівалентам, але гэта толькі на першы погляд. Для ангельскамоўных гэты выраз мае нашмат большы эмацыйны зарад, чым для замежнікаў, якія з прычыны няведаньня або неадчуваньня мовы, проста не ўсьведамляюць сапраўднай вагі гэтай фразы. Гэтае інтэрнацыянальнае словазлучэньне можна было б аднесьці да безэквівалентнай лексыкі, але калі пастарацца ўсё ж знайсьці нейкі адпаведнік, то найбліжэйшым параўнаньнем будзе не паэтычны паход "у ср***", а празаічны праклён, накшталт, „каб ты здох". Таму носьбіты мовы, якія карыстаюцца ангельскай больш-менш сьвядома, стараюцца гэтай фразай асабліва не злоўжываць.

Як сьведчаньне гэтаму фільм „Мярцьвяк" (Dead Man) з Джоні Дэпам у галоўнай ролі. У пошуках рахункавода Ўільяма Блэйка, на якога выдадзеная грашовая ўзнагарода, выпраўляюцца тры наёмныя забойцы, вядомыя на Дзікім Захадзе, як „лаўцы галоваў" (bounty hunters). Хоць фільм належыць да жанру „псыхадэлічны вэстэрн", але ў ім прысутнічаюць элемэнты камэдыі. Адсюль амаль анэкдатычны падбор прафэсійных забойцаў, адзін зь якіх маўчун-канібал, другі – зацяты гаварун, а трэці – малады нэгр па мянушцы Малакасос. Сярод лаўцоў пануе напружаная атмасфэра, якая нагнятаецца яшчэ болей у момант, калі Малакасос пачынае наракаць на сваё знаходжаньне ў пустыннай глухмені "з двума псыхамі, адзін зь якіх маўчыць маўчком... (выбухае дурным сьмехам), а ў другога не закрываецца зяпа..." Абураны пачутым, маўклівы каўбой, якога грае славуты Лэнс Генрыксэн, раіць мурыну ня піць з лужыны, да якой той нахіляецца, каб наталіць смагу: „На тваім месцы я б гэтага не рабіў". „І чаму гэта?" – пытаецца Малакасос. „Гэта дрэнна для твайго здароўя", – адказвае маўчун. На твары малакасоса зьяўляецца грымаса нянавісьці і, кідаючы ў бок маўчуна цяжэрнае і рэзкае „f*ck you", ён схіляецца дзеля таго, каб усё ж напіцца. Доўга ня думаючы, стары маўчун раптоўна выцягвае рэвальвэр з тварам, перапоўненым бяскрайнім абурэньнем, выкрыквае: „F*ck me?", і страляе нахабу ў патыліцу. „F*ck you", – кідае праз момант, ужо ляжачаму ў калюжыне Малакасосу.



Віталь ВОРАНАЎ

Уплаты ў Згуртаваньне
Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíí³:

Д. Горбач	50
П. Лук'янаў	50
Н. Нікіціна	50
С. Панасевіч	50
А. Чэкатоўскі	50

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:

P. O. Box 572
New York, NY 10113

Чэкі выпісвайце на імя
Viktar Yedzinovich.

---

*Паважаныя **Тацяна Асташка, Юлія Вішнеўская** і **Юлія Цяліца,** калі ласка, паведаміце рэдакцыі поштаю ці емэйлам вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "ПАГОНЯ" адбудзецца **ў суботу 11 студзеня 2014 году** на Мангэтане.

Месца правядзеньня сходу:

Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да станцыі падземкі **Union Square**.*

Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Union Square па 15-й вуліцы на скрыжаваньні з Irving Place.

Заля знаходзіцца на другім паверсе будынка.

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

Д. Горбач	30
А. Занковіч	30
В. Кавалёва	30
Ю. Караваева	30
А. Корзун	30
П. Лук'янаў	30
Н. Нікіціна	30
С. Панасевіч	30
Д. Суганяка	30
А. Чэкатоўскі	30

Шчыры дзякуй!

---

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*

VIESTKI
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

*Чэкі з адзнакаю **"Весткі"** выпісвайце на імя скарбніка Згуртаваньня "Пагоня" **Viktar Yedzinovich**.*